культуры і мастацтваў (Мінск, 23 лістапада 2017 г.) / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. – Мінск, 2019. – С. 26-29.

2. Бурко, Р. А. Социальные сети в современном обществе / Р. А. Бурко, Т. В. Терёшина. — Текст : непосредственный // Молодой ученый. — 2014. — № 7 (66). — С. 607-608 [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://moluch.ru/archive/66/11009/ - Дата доступа: 03.03.2021.

3. Махорт, А. Новая культура: тик-ток головного мозга [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.6nomer.ru/prob1.html. - Дата доступа: 07.08.2019.

4. Странные челленджи, мемы и миллиарды коротких видео: почему TikTok стал таким популярным? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://esquire.ru/articles/116582-strannye-chellendzhi-memy-i-milliardy-korotkih-video-pochemu-tiktok-stal-takim-populyarnym/#part0. -Дата доступа: 07.08.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бурко П. А., магистрант

Научный руководитель – Смульская С. Ю., кандидат искусствоведения, доцент

## ТЭМА ЭКАЛОГІІ Ў СУЧАСНЫМ ФОТАМАСТАЦТВЕ БЕЛАРУСІ

У сярэдзіне XX стагоддзя нараджаецца рух, накіраваны на абарону навакольнага асяроддзя. Ён з’яўляецца следствам расчаравання ў дасягненнях навукі і тэхнікі, дзе прырода разумеецца толькі як адна з неабходных частак для функцыянавання вытворчасці. Гэтае разуменне засталося на доўгія часы і закранае сучаснасць, і, такім чынам, узнікаюць усё новыя і новыя метады прыцягнення ўвагі да тэмы экалагічных праблем.

Адным з такіх метадаў з’яўляецца *экалагічнае мастацтва*. Гэта даволі малады жанр сучаснага мастацтва, прадметам якога выступаюць праблемы навакольнага асяроддзя.

Эка-арт уключае ў сябе мноства разнастайных тэндэнцый і жанраў, перасякаецца практычна з усімі сучаснымі відамі мастацтва. Ён не мае нейкага ўласнага тыпу выразнасці, галоўнае ў ім – сэнсавы змест: аб’ектам увагі такога мастацтва з’яўляецца ўвесь навакольны свет, а таксама адносіны паміж ім і чалавекам. Экалагічнае мастацтва здольна таксама існаваць у абсалютна разнастайных формах: як прыклад, у фатаграфіі.

**Фатаграфія** – «тэорыя і практыка атрымання бачнага малюнка аб’ектаў, падзей, працэсаў на святлоадчувальных фатаграфічных матэрыялах» [6, с. 18]. Як галіна тэхнікі, навукі і мастацтва, яна заснавана на здольнасці святла ўтвараць ў святлоадчувальным пласце матэрыялу фатаграфічны малюнак.

Прапануем разгледзець адлюстраванне тэмы экалагічных праблем у працах беларускіх фатографаў на прыкладзе арт-групы «Беларускі клімат», Таццяны Кузняцовай, Рыты Новікавай, Дзяніса Дзюбы і фотапраекта «Лексіка Палесся».

Так, арт-група **«Беларускі клімат»** была створана ў 1987 годзе і ажыццяўляе праекты ў розных напрамках, відах і жанрах сучаснага мастацтва: фатаграфія, жывапіс, графіка, інсталяцыя, тэатр, хэпэнінг, перформанс, музыка і інш. У творчае аб’яднанне ўваходзяць наступныя асобы: Ігар Корзун, Міраслаў Нісенбаўм, Аляксей Навіцкі, Дзмітрый Плакс, Дзмітрый Строцаў, Ірына Сухій, Філіп Чмыр, Яўген Юнаў, а таксама Валянцін Грышко і Аляксандр Краўцоў. У асобных праектах удзельнічалі: Генадзь Хацкевіч, Мак Разанаў, Людміла Салодкая, Дзмітрый Літвякоў, Іна Мохава, Ганна Сыцько, Марат Жумагулаў [1].

Адной з найбольш знакамітых серый работ групы з’яўляецца фатаграфічны перформанс *«Пакарэнне беларускіх пустыняў»* (1988). Вобраз пустыні, пустой прыроднай прасторы, як и незапоўненай ментальнай, – вельмі характэрны матыў для «Беларускага клімату»; пустыня тут – як «абнуленая» прастора, у якой хаатычна нараджаецца гісторыя. Гэта абалонка ў прамым і пераносным сэнсе слова, якую можна чымсьці запоўніць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так, упершыню творцамі падымаецца тэма энвайранменталізму, клопату аб прыродзе: *Што насамрэч стаіць за беларускімі пустынямі? Якім было іх мінулае? Чаго чакаць ад будучага?..*

Увогуле, многія ўдзельнікі і ўдзельніцы творчага аб’яднання «Беларускі клімат» знакаміты сваім экалагічным актывізмам не толькі ў мастацкай форме. Так, Ігар Корзун з’яўляецца каардынатарам кампаніі «Гарадскі ляснічы», а Ірына Сухій – экалагіняй і чаліняй таварыства «Зялёная сетка». Дарэчы, таварыства ўключае ў сябе розныя экалагічныя арганізацыі і ініцыятвы Беларусі, у тым ліку грамадкае аб’яднанне «Экадом», якое знаходзіцца на тэрыторыі культ. цэнтра «Корпус» і ў партнёрстве з якім адбываюцца шматлікія культурна-экалагічныя мерапрыемствы.

Напрыклад, восенню 2020 года ў сталіцы Беларусі адбыўся «Месяц фатаграфіі ў Мінску». На пляцоўцы ля культурнага цэнтра «Корпус» былі прадстаўлены работы некалькіх фотамастакоў менавіта на экалагічную тэматыку, у тым ліку беларускай экаактывісткі Таццяны Кузняцовай з яе серыяй **«Microplastic Everyday»** і Рыты Новікавай з праектам **«AQUA»**.

У праекце «Microplastic Everyday» Кузняцовай прадстаўлены мікраскапічныя выявы мікрапластыка, атрыманыя ў рамках даследавання, праведзенага ў Цэнтры экалагічных рашэнняў (Мінск, Беларусь) і кааліцыі Clean Baltic (Упсала, Швецыя), а таксама выявы з інтэрнэту [5].

«Microplastic Everyday» – гэта фотапраект пра тое, як нябачныя пластыкавыя часцінкі сталі часткай сусветнай рэальнасці. Выявы ў фотапраекце сумяшчаюць здымкі мікрачасцінак пластыку з фатаграфіямі звыклых для нас прадметаў (крэм-скраб, вільготныя сурвэткі, ватныя палачкі, трубачкі для напояў, цыгарэты, блёсткі, чайны пакецік і інш.), якія ўтрымліваюць у сабе пластык, пра што мы часам нават не здагадваемся.

Праз свае работы экаактывістка паказвае, наколькі шмат пластыку – мелкага, а таму і немагчымага для перапрацоўкі – вакол чалавека. Ля кожнага фотаздымку было прыведзена тлумачэнне небяспечнасці пластыкавых вырабаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У фотапраекце «AQUA» Рыты Новікавай таксама адлюстравана тэма экалагічных праблемаў, а менавіта – недахопу водных рэсурсаў.

Праект Рыты уяўляе сабой серыю аўтапартрэтаў, створаных у 2018-2019 гадах. Яго асноўная ідэя – узаемаадносіны чалавека і навакольнага асяроддзя праз ваду, сімвал усяго жывога. На фотаздымках гэтая стыхія прадстаўлена ў розных формах і асацыяцыях, вобразах і метафарах [2].

Яшчэ адным беларускім фатографам, які адлюстроўваю тэму экалагічных праблем, з'яўляецца Дзяніс Дзюба, асноўнай дзейнасцю якога з'яўляецца журналістыка. У 2015 годзе ён заняў другое месца ў адкрытым незалежным конкурсе прэс-фатаграфіі ў Беларусі «Belarus Press Photo» ў намінацыі «Прырода» за свой фотаздымак **«Нераспрададзеныя на навагодніх кірмашах елкі, зваленыя ў Севастопальскім парку»** (Мінск, Беларусь, 3 студзеня 2014) [3, с. 101].

На фатаграфіі ярка прадэманстравана праблема высечкі хвойных лясоў перад навагоднімі святамі. Так, у Беларусі нераспрададзеныя дрэвы трапляюць на сметнікі і ў вельмі рэдкіх выпадках іх выкарыстоўваюць у якіх-небудзь карысных мэтах, што можа прывесці да экалагічных катастроф.

Адным з рэгіёнаў Беларусі, які пацярпеў ад неразумнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, у тым ліку і лясоў, з'яўляецца Палессе. **«Лексіка Палесся»** – гэта фотапраект некалькіх беларускіх фатографаў, які прысвечаны унікальнай прыроднай каштоўнасці беларускага рэгіёну і яго культурнай самабытнасці. Праект падзелены на тры часткі: Палессе як прыгожая каштоўная тэрыторыя з багатай біяразнастайнасцю; як цэнтр этнаграфічнай і гісторыка-культурнай спадчыны; як самабытны свет, знікаючы ў выніку ўмяшання чалавека.

Гэты фотапраект – спроба перанесці гледача ў Палессе, на непаўторны ландшафт рэгіёну, пераплецены з побытам і традыцыямі палешукоў. Аўтары закранулі і станоўчыя бакі, і далікатнасць гэтага рэгіёну, які на працягу 50 гадоў знаходзіцца пад моцным антрапагенным уздзеяннем: асушэнне балот, будаўніцтва воднага шляху Е40, знішчэнне пойменных дуброў і інш. [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Варта адзначыць, што экалагічнае фотамастацтва Беларусі прадстаўлена не толькі прафесійнымі работамі. Так, у краіне адбываецца шмат аматарскіх конкурсаў і фотапраектаў, напрыклад #IamGreta, які быў створаны актывістамі аб'яднання «ВелоГомель», Рэспубліканскі конкурс экалагічных фатаграфій і малюнкаў «Созидая, не разрушай!», Рэспубліканская экалагічная акцыя «Сцяжынкамі Бацькаўшчыны» і інш.

Такім чынам, экалогія з'яўляецца адной з самых актуальных тэм ў мастацтве. Яна заяўляе, што трэба як мага хутчэй вырашыць экалагічныя праблемы, так як яны пачалі трансфармаваць існаванне чалавека і прыроды, а таксама іх будучыню.

Працы эка-мастакоў, на прыкладзе беларускіх фатографаў, заўважаюць любыя такія трансфармацыі рэальнасці і паказваюць іх, часам нават жорстка і бескампрамісна, робяць дэталі бачнымі і рэальнымі. Экалагічнае мастацтва збліжаецца з навукай, эканомікай, палітыкай; яно здольна праілюстраваць ўсё, што адбываецца ў свеце.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Арцімовіч, Т. Група «Беларускі клімат»: фатаграфічны перформанс «Пакарэнне беларускіх пустыняў», 1998 [Электронны рэсурс] / ZBOR. Зборнік эсэ аб ключавых творах беларускага сучаснага мастацтва. – Рэжым доступу: http://zbor.kalektar.org/14/. – Дата доступу: 06.03.2021.

2. Каралавыя рыфы з пластыка чакаюць. Як у Мінску праходзіць штогадовы фестываль «Месяц фатаграфіі» / Зялёны партал. Таварыства «Зялёная сетка». – Рэжым доступу: https://greenbelarus.info/articles/05-10-2020/ischezaet-privychnoe-kak-prohodit-ezhegodnyy-festival-mesyac-fotografii-v-minske. – Дата доступу: 23.03.2021.

3. Міхаленка, С. Прэс-фота Беларусі'15 / С. Міхаленка. – Вільнюс : Standartų Spaustuvė, 2016. – 160 с.

4. На якой мове размаўляе Палессе? Фотавыстава «Лексіка Палесся» адкрываецца ў Мінску [Электронны рэсурс] / Интерfакс-Запад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Информационное агентство. – Рэжым доступу: https://interfax.by/news/afisha/different/1288560/. – Дата доступу: 07.03.2021.

5. Таццяна Кузняцова. «Мікрапластык Everyday» і «CAMERA COVIDu» (29.09-27.11) [Электронны рэсурс] / Month of Photography in Minsk. – Рэжым доступу: – Дата доступу: 28.03.2021.

6. Фатаграфія. Энцыклапедычны даведнік / П. І. Баяраў [і інш.]. – Мн. : Беларуская Энцыклапедыя (БелЭн), 1992. – 400 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бурлова М. В., студент 508 группы
заочной формы обучения
Научный руководитель – Гончарова С. А.,
кандидат технических наук, доцент

## СОЦИАЛЬНЫЕ СЕТИ КАК ИНСТРУМЕНТ ПРОДВИЖЕНИЯ УЧРЕЖДЕНИЙ ОБРАЗОВАНИЯ

В настоящее время система образования в Республике Беларусь стремительно развивается, что приводит к большим изменениям, которые вынуждены учитывать учебные заведения.

Современные учебные заведения функционируют в конкурентной среде. Конкуренция охватывает всевозможные направления: конкуренцию за абитуриентов, сотрудников, привлеченные средства. Активно развивающимся направлением выступает конкуренция между учебными заведениями на уровне специальностей и специализаций. Актуальной для учреждений образования остается поиск действенных инструментов продвижения образовательного учреждения на региональном и глобальном рынках образовательных услуг в интернет-пространстве.

Реклама в сфере образования имеет специфические черты, главной из которых является необходимость передать целевой аудитории определенное количество «технической» информации. Она включает в себя информацию о